Рэктар установы адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны
універсітэт імя Францыска Скарыны»

С.А. Хахомаў
16 сакавіка 2023 г.

# ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

установы адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»
аб дысертацыі Галынскага Рамана Дзмітрыевіча
«Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII стст.», прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці «07.00.02 – айчынная гісторыя»

## Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі

Змест дысертацыі Галынскага Рамана Дзмітрыевіча «Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII стст.», адпавядае спецыяльнасці «07.00.02 – айчынная гісторыя» і галіне «гістарычныя навукі», па якіх работа прадстаўлена да абароны. Дысертацыя прысвечана актуальнай у беларускай гістарычнай навуцы праблеме вывучэння жыцця гарадоў перыяду Сярэднявечча і Новага часу, эвалюцыі гарадской прасторы, вытворча-гаспадарчай дзейнасці гарадскога насельніцтва, сацыяльнай тапаграфіі горада на прыкладзе Быхава. Аўтар разглядае ўмовы ўзнікнення Быхава, працэсы, якія ўплывалі на яго эвалюцыю, фарміравання жыццёвай прасторы мяшчан, яго матэрыяльнай культуры быхаўчан. Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі, яе высновам і асноўным палажэнням, якія выносяцца на абарону.

## Навуковы ўклад суіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з адзнакай яго значнасці

Навуковы ўклад суіскальніка заснаваны на комплексным аналізе эвалюцыі гарадской прасторы Быхава разам з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго насельніцтва ў XIV-XVIII стст. на аснове вялізнай крыніцазнаўчай базы. Суіскальнікам разгледжаны уплыў прыродна-кліматычных, сацыяльных, знешнепалітычных змен на фарміраванне населенага пункта, а таксама вызначана іх роля ў фарміраванні гарадской прасторы Быхава. На аснове масіва пісьмовых і рэчавых крыніц суіскальнікам вызначана рамесная спецыялізацыя горада, ахарактарызавана яго сацыяльна-эканамічная і палітычная роля ў рэгіёне. У навуковы ўжытак уведзены шэраг

новых крыніц, створаны каталог археалагічнага матэрыялу, выканана рэканструкцыя знешняга выгляду археалагічных аб'ектаў, гарадской забудовы, комплексу бытавых рэчаў. Значнасць навуковага ўкладу суіскальніка ў рашэнне пастаўленых задач вызначаецца тым, што дысертацыя Галынскага Рамана Дзмітрыевіча поўна і даставерна адлюстроўвае эвалюцыю гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельніцтва Быхава ў XIV-XVIII ст.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі**
**(з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія суіскальніку можа быць прысуджана шуканая вучоная ступень**

У дысертацыйным даследаванні Р.Д. Галынскага ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі на аснове шырокай базы гістарычных крыніц праведзены комплексны аналіз эвалюцыі гарадской прасторы і гаспадарчай дзейнасці насельніцтва Быхава ў XIV-XVIII ст. Да ліку атрыманых суіскальнікам новых навуковых вынікаў, за якія яму можа быць прысуджана шуканая вучоная ступень, можна аднесці наступныя:

– упершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплексна даследаваны шырокі спектр крыніц па гісторыі матэрыяльнай культуры беларускага сярэдневяковага горада;
– зроблены комплексны аналіз эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII ст.;
– распрацавана аўтарская тыпалогія шэрагу археалагічных комплексаў, на падставе якіх прасочана эвалюцыя паўсядзённага жыцця жыхароў Быхава ў XIV-XVIII ст.;
– адлюстраваны працэс развіцця вытворча-гаспадарчага жыцця насельніцтва Быхава ад часоў першай згадкі горада ў гістарычных крыніцах да пераўтварэння яго ў цэнтр графства;
– разгледжаны ўплыў прыродна-кліматычных, сацыяльных, знешнепалітычных змен на фарміраванне горада і вызначэнне іх ролі ў фарміраванні гарадской прасторы Быхава;
– вызначана рамесная спецыялізацыя Быхава як аснова фарміравання вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII ст.;
– высветлены прычыны і ўмовы эвалюцыі Быхава ў адну з мацнейшых фартэцый рэгіёна з характарыстыкай яго сацыяльна-эканамічнай і палітычнай ролі ў Падняпроўі.

Навуковая навізна і практычная значнасць вынікаў, атрыманых суіскальнікам, не выклікае сумненняў і абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі спецыяльнага комплекснага даследавання, у якім гарадская прастора Быхава з'яўляецца самастойным прадметам вывучэння. Навукова абгрунтаваная інтэрпрэтацыя вялікага аб'ёму фактычнага матэрыялу, лагічнасць заключных высноў дысертацыі пярэчанняў не выклікаюць.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Змест дысертацыі і аўтарэферата сведчыць, што навуковая кваліфікацыя Галынскага Рамана Дзмітрыевіча цалкам адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, на якую ён прэтэндуе. Дысертацыя з'яўляецца самастойным, завершаным даследаваннем, выкананым на сучасным навуковым узроўні. Яна заснавана на рэпрэзентатыўнай базе крыніц, выяўленых суіскальнікам. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры складае 370 пазіцый (без уліку ўласных публікацый суіскальніка). Крыніцы інтэрпрэтаваны з выкарыстаннем разнастайных метадаў гістарычнага даследавання, што павялічвае дакладнасць атрыманых вынікаў. Р.Д. Галынскі з'яўляецца аўтарам 30 публікацый, з іх 8 артыкулаў у часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання (аб'ём – 5,21 аўт. арк.), 19 артыкулаў у зборніках навуковых канферэнцый (4,7 аўт. арк.), 2 – у матэрыялах канферэнцый (0,07 аўт. арк.), 1 манаграфіі ў сааўтарстве (0,17 аўт. арк.). Высновы лагічна вынікаюць з праведзенага даследавання, навукова абгрунтаваныя вялікім фактычным матэрыялам, адпавядаюць пастаўленай мэце і задачам, нясуць у сабе новую навуковую інфармацыю. Абгрунтаванасць і вернасць высноў дысертацыі падмацоўваецца 15 якаснымі дадаткамі (планы горада, выявы археалагічных матэрыялаў, рэканструкцый, узбраення, іншы ілюстрацыйны матэрыял, вытрымкі з гістарычных крыніц, ксеракопіі актаў укаранення).

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў далейшых навуковых даследаваннях, у вучэбнай рабоце (пры распрацоўцы лекцый, правядзенні практычных заняткаў, падрыхтоўцы вучэбнай літаратуры) па гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай дзяржаўнасці, краязнаўству, а таксама ў ідэалагічна-выхаваўчай рабоце. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць знайсці практычнае прымяненне ў музейна-экскурсійнай і турысцкай дзейнасці.

Вынікі даследавання выкарыстаны пры распрацоўцы музейных і лекцыйных заняткаў дзяржаўнай установы культуры «Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей», што пацверджана 4 акатамі аб укараненні.

**Заўвагі**

Станоўча ацэньваючы дысертацыю Рамана Дзмітрыевіча Галынскага, лічым неабходным выказаць наступныя заўвагі:

1. Пры разнастайнасці гістарычных крыніц, што задзейнічаў суіскальнік у якасці базіса свайго даследвання, трэба заўважыць недастатковую ўвагу да пісьмовых крыніц яўрэйскага паходжання, якія валодаюць вялізным патэнцыялам па дапаўненню карціны эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII ст.

2. Падрабязна разглядаючы прыродна-кліматычныя і агульнагістарычныя ўмовы развіцця Быхава суіскальнікам вельмі сціпла разгледжаны спецыфічныя для беларускіх зямель этнарэлігійныя ўмовы развіцця горада.

3. Пры якаснай характарыстыцы суіскальнікам вытворча-гаспадарчай дзейнасці гарадскога насельніцтва Быхава ў XIV-XVIII ст. застаецца не поўнасцю раскрытым пытанне аб спецыфіцы гэтай дзейнасці ў разрэзе этнарэлігійнай прыналежнасці яго жыхароў.

4. Адзначаючы выдатную характарыстыку суіскальнікам заняткаў гараджан (рамесную вытворчасць, сферу паслуг, промыслы, ваенную справу), даволі сціпла выглядае характарыстыка ўнутранага і знешняга гандлю Быхава;

5. Пры адлюстраванні месца Быхава ў палітычных і ваенных падзеях у Падняпроўі, варта звярнуць увагу на некаторыя тэрміналагічныя аспекты. У прыватнасці з XVI-XVII ст. больш слушным тэрмінам для абазначэння "Маскоўскай дзяржавы" падаецца "Расійская дзяржава" або "Расійскае царства".

Разам з тым, выказаныя заўвагі ніякім чынам не змяншаюць высокага навуковага ўзроўня прадстаўленага даследавання.

**Заключэнне**

Дысертацыя Галынскага Рамана Дзмітрыевіча «Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII стст.», прадстаўленая на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці «07.00.02 – айчынная гісторыя», з'яўляецца кваліфікацыйным даследаваннем і адпавядае патрабаванням пп. 19–21 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці «07.00.02 – айчынная гісторыя» за комплекснае даследаванне эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельніцтва горада ў XIV-XVIII ст., што ўключае ў сябе:

– выдзяленне трох хаsærаналагічных перыядаў гістарыяграфіі Быхава і іх характарыстыку (першапачатковы этап XIX – сярэдзіне XX ст. які меў у асноўным фрагментарны і кампілятыўны характар; другі этап урбаністычных даследаванняў 50-80-х гг. XX ст.; трэці этап, які характарызуецца комплексным даследаваннем беларускіх гарадоў);

– распрацоўку перыядызацыі генезіса Быхава (ад сельскага паселішча з феадальным дваром у XIV ст., да буйнога прыватнаўласніцкага горада – цэнтра графства з падрабязнай характарыстыкай гэтых этапаў;

– паказ спецыфікі трансфармацыі Быхава ў розныя перыяды яго развіцця з адлюстраваннем змен яго лакалізацыі і ўплыву гэтых змен на бытавое жыццё і вытворча-гаспадарчую дзейнасць жыхароў горада;

– выяўленне і характарыстыку фактараў, якія ўплывалі на эвалюцыю гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчую дзейнасць яго насельніцтва;

– раскрыццё, характарыстыку і абгрунтаванне асноўных функцый Быхава, на розных этапах існавання населенага пункта.

Водзыў аб дысертацыі Галынскага Рамана Дзмітрыевіча «Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV-XVIII стст.», прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці «07.00.02 – айчынная гісторыя», згодна загаду рэктара ГДУ імя Ф. Скарыны ад 09.03.2023 № 368 разгледжаны на навуковым семінары факультэта гісторыі і міжкультурных камунікацый УА "ГДУ імя Ф. Скарыны" 16.03.2023, пратакол № 1.

Галынскі Раман Дзмітрыевіч выступіў на семінары з дакладам. На семінары адбылася дыскусія, суіскальнік адказаў на ўсе пытанні, пастаўленыя ўдзельнікамі семінара.

У рабоце семінара прымалі ўдзел 9 выкладчыкаў факультэта гісторыі і міжкультурных камунікацый установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны", з іх: 1 доктар навук: У.М. Калмыкоў і 8 кандыдатаў навук: Г.А. Аляксейчанка, А.М. Дуброўка, С.Б. Жыхараў, А.М. Кротаў, А.В. Марчанка, М.І. Старавойтаў, Д.М. Талочка, С.А. Чаропка.

Вынікі галасавання «за» – 9, «супраць» – 0, «устрымаліся» – 0.

Кіраўнік навуковага семінара:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Д.М. Талочка

Сакратар навуковага семінара:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.М. Дуброўка

Эксперт апаніруючай арганізацыі:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.А. Чаропка